- практическая деятельность: применение полученных знаний в работе с детьми дошкольного и школьного возраста на уроках музыки, руководство творческими коллективами (работа в вокальных кружках, музыкально-театральных студиях), организация конкурсов, концертов.

Благодаря самостоятельной работе учебная деятельность студента превращается в непрерывный процесс. Только в практической самостоятельной деятельности студенты могут научиться пользоваться приобретенными знаниями и навыками, применяя их в будущем труде.

*В. І. Свірыдзенка (Мінск)*

## САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Самастойная праца студэнтаў з'яўляецца адным з важнейшых элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта звязана з тым, што выкладчык толькі арганізуе і накіроўвае пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, а яе эфектыўнасць залежыць ад уласных намаганняў студэнтаў. Таму самастойнае набыццё ведаў – адметная рыса навучання ў ВНУ. Па сутнасці, увесь працэс навучання ў вышэйшай школе – спецыяльна арганізаваная самастойная праца студэнтаў.

Пры правільнай арганізацыі самападрыхтоўка мае вырашальнае значэнне для развіцця самастойнасці як адной з вядучых якасцей спецыяліста з універсітэцкай адукацыяй і выступае сродкам, які забяспечвае студэнтам:

- свядомае і добрае засваенне ведаў па прадмеце;
- аваладанне спосабамі і прыёмамі самаадукацыі;
- развіццё патрэбнасці ў самастойным папаўненні ведаў.

Самападрыхтоўка спрыяе фарміраванню высокай культуры разумовай дзейнасці, набыццю прыёмаў і навыкаў самастойнай працы, уменняў рацыянальна выкарыстоўваць і размяркоўваць свой час, назапашваць і засвойваць неабходную для паспяховага навучання і прафесійнага станаўлення інфармацыю. Яна развівае ў студэнтаў арганізаванасць, дысцыплінаванасць, ініцыятыўнасць, волю, выпрацоўвае разумовыя ўменні і аперацыі (аналіз, сінтэз, параўнанне, супастаўленне і інш.), дазваляе сфарміраваць свой уласны стыль працы, які найбольш поўна адпавядае асабістым схільнасцям і пазнавальным навыкам студэнта.

Для паспяховай арганізацыі самастойнай працы студэнтаў пры вывучэнні методыкі выкладання беларускай мовы ў сярэдняй школе можна выкарыстоўваць такую форму заняткаў, як семінар-практыкум. Сутнасць яе ў тым, што студэнты на занятках аб'ядноўваюцца ў групы і кожная з іх атрымлівае заданне. Калі праходзіць адведзены на выкананне задання час, група робіць справаздачу аб сваёй працы выкладчыку, студэнту-кантралёру, другой групе. Найбольш эфектыўным варыянтам, на думку В.В.Гузеева [1], з'яўляецца «публічная абарона»: прадстаўнік групы, прызначаны выкладчыкам, паведамляе ўсім задачу і

выпрацаваныя групай спосабы яе рашэння. Напрыклад, на практычных занятках па тэме «Методыка развіцця маўлення вучняў» на абмеркаванне выносяцца наступныя пытанні:

1. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення.
2. Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў.
3. Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення.

Адпаведна студэнты аб'ядноўваюцца ў 3 групы. Кожная група атрымлівае заданне: падрыхтаваць даклад па адным з пытанняў, падабраць літаратуру, распрацаваць канспект урока і правесці гэты ўрок на практычных занятках. Студэнты дзвюх астатніх груп абмяркоўваюць і аналізуюць праведзены ўрок.

Калі пастаўленая выкладчыкам задача дапускае варыянты, то яе могуць рашаць групы-канкурэнты. У такім выпадку пры абароне адна група становіцца апанентам другой.

Семінар-практыкум з'яўляецца мабільнай формай заняткаў, якая дазваляе дасягаць самых разнастайных педагагічных, у прыватнасці дыдактычных, мэт. Важна арганізаваць нефармальную абарону і зрабіць так, каб пытанні былі значнымі і цікавымі. Пасля калектыўнай ацэнкі працы групы ўсе яе ўдзельнікі атрымліваюць аднолькавыя балы, што ўключае механізм групавой адказнасці.

Развіццю самастойнасці, творчага мыслення студэнтаў, фарміраванню пазнавальнай і навуковай актыўнасці, уменняў у вобласці навуковага пошуку спрыяе выкарыстанне пошукава-творчых метадаў навучання. Спынімся на метадзе «Думай, слухай, прапаноўвай», які апісала Р. С. Піёнава [3]. Мэта яго прымянення – развіваць у студэнтаў пошукавую пазнавальную актыўнасць, здольнасць знаходзіць рашэнне (або некалькі рашэнняў) праблемы, адшукваць выхад з канфліктнай педагагічнай сітуацыі. Метад прымяняецца наступным чынам: кожны студэнт атрымлівае канкрэтнае заданне пошукава-творчага характару, якое павінен выканаць за пэўны адрэзак часу; затым па чарзе студэнты абгрунтоўваюць выбраны спосаб рашэння праблемы, астатнія слухаюць, думаюць, і, магчыма, нехта прапаноўвае яшчэ адзін варыянт дзеянняў. Напрыклад, на практычных занятках па тэме «Методыка вывучэння марфалогіі» можна прапанаваць наступныя заданні:

1. Адным з прыёмаў, што садзейнічаюць развіццю маўленчай мабільнасці, з'яўляецца пераклад. Прааналізуйце прыведзены ніжэй моўны матэрыял і вызначце: Якая мэта перакладу? На што скіравана ўвага вучняў?

*Дочка, подошва, ольха, крапива, верба; глупости, крупа, чернила, белила; брала, несла, везла, нести, везти; семь, восемь, семьдесят, семьсот*

2. Складзіце практыкаванні для паўтарэння правапісу, марфемнай будовы, арфаэпічных нормаў і словаўтварэння дзеясловаў.

3. Як растлумачыць правапіс не (ня) з прыметнікамі, каб, акрамя знаёмства з новай тэмай, паўтарыць правапіс не (ня) з назоўнікамі і сістэматызаваць веды вучняў?

Студэнты звычайна з інтарэсам успрымаюць выкарыстанне дадзенага метаду на практычных занятках. Каштоўнасць яго заключаецца ў тым, што на адных занятках ствараюцца перадумовы для разгляду многіх пытанняў, пошуку і знаходжання адказаў на іх, а таксама для паўтарэння і замацавання вучэбнага матэрыялу.

Заняткі з выкарыстаннем апісаных формаў і метадаў выкладання атрымліваюцца ажыўленымі і цікавымі. Паколькі заданні, якія прапаноўваюцца групам і асобным студэнтам, адносна незалежныя, то ў межах такіх заняткаў можна рэалізоўваць навучанне не толькі на розных узроўнях плануемых вынікаў, але і з розным зместам.

*Літаратура*


1. Гузеев В. В. Теория и практика интегральных образовательных технологий. М., 2001.
2. Ляшчынская В. А. Методыка выкладання беларускай мовы: Задачы і практыканні: Вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ. Мн., 1998.
3. Пионова Р. С. Педагогика высшей школы. Мн., 2002.


*Е. Б. Сивицкая (Минск)*

## ОРГАНИЗАЦИЯ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ ПРИ ИЗУЧЕНИИ КУРСА «ХОРОВЕДЕНИЕ»

Самостоятельная работа как важнейшая качественная характеристика учебной деятельности сегодня активно обсуждается и в педагогической теории, и педагогами-практиками. Особое внимание при этом обращается на ее формы, способы организации и методы оценки. Собственно, сама нынешняя трансформация высшего образования, особенно с учетом растущей роли информационных и коммуникативных технологий в преподавании и обучении, в целом ориентирована именно на возрастание значения самостоятельной, независимой учебной деятельности студентов.

Как известно, одним из определяющих факторов организации самостоятельной работы является учет уровня мотивации учения студента. При низком уровне мотивации его познавательная деятельность носит репродуктивный характер, следовательно, тип самостоятельной работы может быть самым низким – по образцам. В то же время само содержание учебного материала может служить средством повышения мотивации, следовательно, уже на этом уровне в содержании могут быть реализованы междисциплинарные связи с профилирующими и фундаментальными курсами с учетом их доступности для студентов. Развитие мотивации в процессе выполнения самостоятельной работы, формирование познавательной активности непосредственно связаны с формированием нравственных качеств личности.

Поскольку задача педагога – формирование творческой личности, познавательная деятельность которой продуктивна, уже на первом этапе обучения отбираются средства, способствующие повышению мотивации. Одно из таких основополагающих средств – содержание учебного материала. Отсюда тексты, предназначенные для самостоятельной работы, в определенной доступной для студентов мере могут быть профессионально ориентированными. Для организации самостоятельной работы необходимо знать, какие умения и личностные качества формируются при ее выполнении на разных этапах обучения. С правильным использованием междисциплинарных связей и учетом временных затрат на выполнение самостоятельной работы органически связаны выделе-